Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды за мітынг супраць размяшчэння расійскай авіябазы (абнаўляецца)

09.10.2015 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед



Суд Цэнтральнага раёна Менска.

Сёння ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска разглядаюцца адміністрацыйныя справы ўдзельнікаў і арганізатараў акцыі "За мірную, нейтральную Беларусь". Пратэстны мітынг супраць размяшчэння расійскай авіябазы адбыўся 4 кастрычніка ў Мінску на Плошчы Свабоды.

Суддзі разгледзяць пратаколы правапарушэнняў, складзеныя на старшыню Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоля Лябедзьку**, **Уладзіміра Някляева**, былога палітвязня **Мікалая Статкевіча**, лідэра руху "Разам" **Вячаслава Сіўчыка**, актывіста з Кобрына **Алеся Меха**, актывістаў **Алеся Таўстыкі, Максіма Вінярскага**, мастака **Аляксея Марачкіна**.

Пратакол складзены таксама на першага намесніка старшыні Руху "За Свабоду" **Юрася Губарэвіча**, аднак невядома, ці атрымаў ён позву ў суд на 9 кастрычніка.

Сачыце за навінамі з суда ў twitter па хаштэгу #ControlBY

10-00. Справу Анатоля Лябедзькі разглядае суддзя **Міхаіл Хома**. Ён забараніў весці відэа і фотаздымку. Адхіліў хадайніцтва Лябедзькі аб адводзе суддзі. Выступае сведка - амапавец І. Лавіцкі. Ён прызнаецца, што не ведае артыкул 45 Выбарчага кодэксу. Не памятае, дзе стаяў пад час мітынгу, але бачыў 50-100 чалавек з бел-чырвона белымі сцягамі. Другі сведка – амапавец ГУУС Менгарвыканкама В. П. Ляшковіч. Кажа, што яму паведамілі, што адбываецца несанкцыянаванае мерапрыемства.

Анатоль Лябедзька заявіў, што мае права, як і кандыдаты весці агітацыю і абмяркоўваць праблемы выбараў. А яго судзяць за гэтае права. Палітык абвінаваціў супрацоўнікаў міліцыі ў ілжэсведчанні і прасіў суд пакараць іх, але безвынікова. Суддзя адхіліла хадайніцтва пра выклік у суд супрацоўніка міліцыі (Кухто), які складаў пратакол на Лябедзьку і пайшоў прымаць рашэнне па справе. Суд пастанавіў аштрафаваць Лябедзьку на 50 б.в. (9 мільёнаў рублёў).

10-40. Справу **Алеся Марачкіна** разглядае суддзя **Аляксандр Якунчыхін** (арт. 23.34 КаАП). Сам мастак на суд не з'явіўся. Суддзя вынес пастанову - штраф 20 б.в. - 3 600 000 рублёў. Сведкі - Сідаракін, Камека, Зубцоў з Цэнтральнага РУУСа.

Суддзя **Вікторыя Шабуня** разглядае адміністрацыйную справу **Вячаслава Сіўчыка**, які таксама на суд не з'явіўся. Яго звінавацілі адразу па 3 артыкулах - 23.34, яшчэ адзін пратакол па 23.34 і 17.1 КаАП і пастанавілі аштрафаваць на 60 базавых велічынь.

У судзе Цэнтральнага раёна зараз знаходзіцца **Аляксандар Мех**, яго будзіць судзіць у 12-00. Справу разглядае суддзя **Тацяна Рак.** Алесю Меху далі штраф у памеры 40 базавых велічынь (7 мільёнаў 200 тысяч рублёў).

У 14-30 суддзя **Н. Вайцэховіч** пачне разгляд справы **Уладзіміра Някляева** па ч.3 арт 23.34 КаАП. Някляеў на суд не з'явіўся, пакараны штрафам у памеры 50 базавых велічынь.

У 14-30 адміністрацыйную справу **Мікалая Статкевіча** пачне разглядаць суддзя **В. Есьман.** (ч.3 арт. 23.34 КаАП). Аштрафаваны на 50 базавых велічынь.

У 14-30 пачнецца суд над **Максімам Вінярскім** (суддзя **Вікторыя Шабуня**, ч.3 арт.23.34 КаАП).

У 14-30 суддзя **Аляксандр Якунчыхін** пачне разгляд справы **Алеся Талстыкі** (ч.1 арт.23.34). Суддзя Якунчыхін прысудзіў Алесю Талстыку 25 базавых, 4,5 мільёна рублёў.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY